*В.Е.ЛЯВОНЧЫКАЎ*
*Л.І.КАЗЛОЎСКАЯ*

**У ПЕДАГАГІЧНЫМ САВЕЦЕ**

3 кастрычніка 1996 г. у БДУ культуры дзейнічае савет па абароне дысертацый К 09.03.01, які прымае да абароны кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці 05.25.03 "бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства" і па спецыяльнасці 13.00.05 "тэорыя, методыка, арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці" з прысуджэннем вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

28 мая 2001 г. на базе савета па абароне кандыдацкіх дысертацый загадам ВАК Беларусі быў створаны савет па абароне дысертацый Д 09.03.03, якому дазволена прымаць да абароны доктарскія і кандыдацкія дысертацыі па спецыяльнасці 05.25.03 "бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства" і па спецыяльнасці 13.00.05 "тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці".

З кастрычніка 1996 г. па красавік 2001 г. на савеце К 09.03.01 паспяхова абаронены 16 дысертацый, з іх 8 па спецыяльнасці “бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства”, 7 па спецыяльнасці “тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветніцкай работы” і адна па спецыяльнасці “тэорыя і методыка навучання музыцы” (разавая абарона). У кандыдацкай дысертацыі Ібрагіма Бадархана (аспірант універсітэта, грамадзянін Сірыі) "Гісторыя і сучасны стан нацыянальнай бібліяграфіі Сірыі ў святле канцэпцыі міжнароднай праграмы УПУ/МПМ" па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства" комплексна даследаваны праблемы нацыянальнай бібліяграфіі Сірыі ва ўзаемасувязі з рэгіянальнай (агульнаарабскай) нацыянальнай бібліяграфіяй і міжнароднай праграмай універсальнага бібліяграфічнага ўліку і прапанавана аптымальная тэарэтычная мадэль ва ўмовах Сірыі. Даследчык упершыню выказаў ідэю аб арганізацыі на карпаратыўных умовах міжнароднага абмену бібліяграфічнай інфармацыяй шляхам стварэння рэгіянальных бібліяграфічных цэнтраў для пэўных краін кантынента ці яго часткі. Такімі цэнтрамі могуць быць цэнтр дакументацыі і інфармацыі АЛЕКСа, Брытанская нацыянальная бібліятэка — для краін Еўрапейскай садружнасці, Бібліятэка Кангрэса ЗША — для краін Паўночнай Амерыкі, Усерасійская кніжная палата — для краін СНД. Цікавай з’яўляецца глава, прысвечаная гісторыі агульнаарабскай нацыянальнай бібліяграфіі з Х ст. па ХХ ст.

У кандыдацкай дысертацыі Л.І.Ракавецкай “Тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчнага менеджменту” распрацаваны прынцыпы бібліятэчнага менеджменту, прапанаваны комплекс метадаў кіравання (даследчы, эканамічны, арганізацыйна-распарадчы, сацыяльна-псіхалагічны), аптымальная мадэль стратэгічнага планавання ў бібліятэцы, якая ўключае этапы фарміравання стратэгічных мэт, аналіз асяроддзя, аналіз стратэгічных альтэрнатыў і выбар стратэгіі, шляхі рэалізацыі абранай стратэгіі, размеркавання рэсурсаў, ацэнку стратэгіі плана; навукова абгрунтаваны методыкі ўкаранення маркетынгу з улікам адаптацыі яго да практыкі работы бібліятэкі.

Савет разгледзеў кандыдацкую дысертацыю Т.В.Кузьмініч “Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі па гісторыі Беларусі: тэарэтыка-метадычныя праблемы” і прыняў рашэнне аб прысуджэнні ёй вучонай ступені кандыдата педагагічных навук. Аўтарам упершыню прааналізаваны дакументны масіў і патокі па гісторыі Беларусі, выяўлена іх элементная структура з улікам сінхронна-дыяхроннага характару гістарычнай інфармацыі, а таксама высветлены інфармацыйныя патрэбы розных груп карыстальнікаў. Усё гэта дазволіла Т.В.Кузьмініч навукова абгрунтаваць вербальную мадэль сістэмы бібліяграфічнай інфармацыі па гісторыі і гістарычных навуках, выявіць сістэмаўтваральныя кампаненты, функцыянальную структуру, арганізацыйныя рэсурсазберагальныя напрамкі.

У кандыдацкай дысертацыі І.І.Дрыгі “Сістэма бібліяграфічнай інфармацыі па мастацтве ў Рэспубліцы Беларусь: тэарэтыка-метадычныя праблемы” грунтоўна вывучаны дакументныя патокі і масівы па мастацтве ў Беларусі, вызначаны іх аб’ём, дынаміка развіцця, семантычная, прагматычная, відавая, моўная, геаграфічная і выдавецкая структуры, выяўлены асаблівасці канцэнтрацыі і рассеяння публікацый. Аўтар прапанавала арыгінальную класіфікацыю карыстальнікаў інфармацыі па мастацтве, пабудаваную на прыкладах зместу, характару дзейнасці і сацыяльнай ролі людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Грунтоўнае вывучэнне метасістэмы бібліяграфічнай інфармацыі дазволіла І.І.Дрызе тэарэтычна абгрунтаваць аптымальную мадэль, якая ўключае функцыянальную дзейсную і відавую структуры.

Галоўны вывад кандыдацкай дысертацыі Аль-Ахмад Нідала (аспірант нашага універсітэта, грамадзянін Іарданіі) “Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і асаблівасці яго выкарыстання ў Іарданіі” наступны: бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг уяўляе інтэграваны від дзейнасці, які ўключае метады камерцыйнага, некамерцыйнага і сацыяльнага маркетынгу і можа выкарыстоўвацца як на ўзроўні бібліятэчнай справы цалкам, так і на ўзроўні асобнай бібліятэкі ці маркетынгу прадуктаў і паслуг, прапануемых на інфармацыйным рынку па арганізацыі вольнага часу. Аўтарам да-кладна выяўлены ўнутраныя і знешнія фактары, якія ўздзейнічаюць на бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг у Іарданіі.

У кандыдацкай дысертацыі А.В.Прадзеінай “Краязнаўчая бібліяграфічная дзейнасць абласных універсальных навуковых бібліятэк Беларусі: гісторыя і тэарэтыка-метадычныя праблемы” навукова абгрунтаваны тыпы рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь, па якіх абласныя бібліятэкі могуць ствараць інфармацыйныя крыніцы ці павінны раскрываць змест краязнаўчых дакументальных патокаў і масіваў у міжгаліновых і комплексных паказальніках бібліяграфічнай інфармацыі, удакладнены аб’ём і змест паняццяў “рэгіянальны дакумент”, “рэгіянальны бібліяграфічны дапаможнік”; распрацавана структура краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей; абгрунтаваны арганізацыйныя прынцыпы і метадычныя прыёмы рэгіянальнай бібліяграфічнай дзейнасці, прапанавана аптымальная тэарэтычная мадэль сістэмы рэгіянальных бібліяграфічных дапаможнікаў.

Усе абароненыя дысертацыі выкананы ў рамках навуковых да-следаванняў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. Вынікі даследаванняў укараняюцца ў практыку работы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, навуковых універсальных і галіновых бібліятэк; абласных, раённых, гарадскіх бібліятэк, а таксама ў працэс навучання на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм БДУ культуры. Напрыклад, матэрыялы даследавання Л.І.Ракавецкай знайшлі практычнае прымяненне пры падрыхтоўцы метадычных рэкамендацый, тэхналагічных інструкцый і рэгламентаваных дакументаў у рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і іншых бібліятэк рэспублікі.

Тэматыка навуковых даследаванняў па спецыяльнасці 13.00.05 “тэорыя, методыка і арганізацыя культурна-асветніцкай работы” актуальная, адпавядае спецыфіцы сацыякультурнай дзейнасці універсітэта. Іх вынікі ўкараняюцца ў практыку сацыякультурнай дзейнасці ва ўстановах культуры рэспублікі, навучальным працэсе, у школах і пазашкольных установах, рэкрэацыйна-аздараўленчых і рэабілітацыйных цэнтрах, інтэрнатах і інш.

Так, напрыклад, дысертацыйнае даследаванне Н.У.Самерсавай “Аптымізацыя экалагічнай адукацыі і выхавання падлеткаў ва ўмовах сацыякультурнай сферы” ўкаранёна ў практыку работы экалагічных цэнтраў Рэспубулікі Беларусь. На падставе даследавання распрацаваны аўтарскі семінар, які штомесячна праводзіцца ў Міжнародным адукацыйным цэнтры г. Мінска. Ён уключае методыку сенсорнага ўспрымання прыроды, псіхалагічнага трэнінгу па экалагічным выхаванні моладзі. На кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры распрацаваны курс “Экапедагогіка”.

У дысертацыйным даследаванні А.А.Корбут “Педагагічныя асновы дзейнасці сацыяльнага педагога па карэкцыі псіхалагічнага стану малодшых школьнікаў сродкамі гульні” ўпершыню разглядаецца гульня як сродак карэкцыі сарамлівасці, трывожнасці, страху дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Аўтарам распрацавана класіфікацыя гульняў, якія маюць дачыненне да азначанай праблемы. Прапанаваныя інавацыйныя гульнёвыя тэхналогіі паспяхова выкарыстоўваюцца ў пазашкольных, клубных установах, рэабілітацыйных цэнтрах. Курс “Тэрапія гульнёй” чытаецца на кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці.

Дысертацыйныя даследаванні І.М.Грамовіч і Г.В.Высоцкага разглядаюць пытанні ўдасканалення работы па навучанні студэнтаў народным спевам з улікам рэгіянальных песенных традыцый Беларусі, а таксама фарміравання міжасобаснага статусу школьнікаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у працэсе мастацкай дзейнасці. Матэрыялы даследаванняў выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе БДУ культуры на факультэце мастацкай творчасці і ў самадзейных творчых калектывах Беларусі. Трэба адзначыць аўтарскія падыходы да арганізацыі творчага працэсу ў мастацкіх калектывах, якія распрацаваны навукоўцамі.

С.А.Валахановіч у сваім даследаванні “Мастацка-творчая дзейнасць сям’і як фактар развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту” вылучыла тры тыпы сямей, якія адрозніваюцца культурай узаемаадносін з дзецьмі: 1) гарманічны, ці сугучны; 2) дысгарманічны; 3) прамежкавы. Такое дзяленне сямей дапамагае даследчыкам і сацыяльным педагогам мэтанакіравана арганізоўваць творчую дзейнасць з імі. Вынікі даследавання выкарыстоўваюцца ў сацыяльна-культурнай рабоце з сем’ямі ў рэспубліцы.

Даследаванне суіскальніка У.М.Макарава “Культурна-адпачынкавая работа як сродак прафілактыкі дэвіянтных паводзін ваеннаслужачых” выканана на матэрыялах аналізу дзейнасці армейскіх культурна-асветных устаноў рэспублікі. Навуковая значнасць даследавання заключаецца ў распрацоўцы новага падыходу да праблемы арганізацыі і зместу культурна-адпачынкавай работы ў арміі і пераводу яе з асветніцкай сферы ў сферу сацыяльнага прыярытэту. Складзеныя ім праграмы прафілактыкі дэвіянтных паводзін ваеннаслужачых выкарыстоўваюцца ў армейскіх культурна-асветных установах, а таксама ў іншых органах выхаваўчай работы Міністэрства абароны.

Навуковыя кіраўнікі дысертацыйных работ — вядомыя даследчыкі, навукоўцы ў галіне сацыякультурнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь. Трэба адзначыць, што ўсе рашэнні савета аб прысуджэнні вучоных ступеней кандыдатаў навук былі зацверджаны прэзідыумам ВАК Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ